# ТВОРЧАСЦЬ ВАСІЛЯ БЫКАВА: ФІЛАСОФІЯ ПЕСІМІЗМУ?

**А.М. Аўчарэнка**

Традыцыйна творчасць В.Быкава крытыкі вызначаюць як песімістычную. Аднак менавіта традыцыйнасць гэтай думкі і вымагае больш уважлівага аналізу дадзенай праблемы. Тут вельмі важна асэнсаваць: дзе тыя складнікі, на падставе якіх і выводзіцца формула песімістычнасці твораў пісьменніка.

Пэўна, сярод іх вылучаецца факт трагічнага фіналу твораў В.Быкава, калі ягоныя героі гінуць, прычым сама смерць можа выступаць як вынік асэнсаванага выбару, як, прыкладам, у апавяданні "На Чорных лядах". Аднак гаварыць пра песімістычны кантэкст менавіта гэтага твора не мае сэнсу, бо ўрэшце рэшт сярод жывых застаецца хлопчык Валодзька. А гэта ці не ёсць сімвалам неўміручасці, пераемнасці беларускай нацыянальнай ідэі? Што ж датычыць жудаснага вырашэння лёсу астатніх герояў, то такі фінал абумоўлены найперш гістарычнай праўдай, адлюстраванне і асэнсаванне трагічнасці якой і ёсць задачай пісьменніка.

Акрамя таго, сучасная крытыка выводзіць даволі цікавую тыпалагічную паралель: гінуць многія з герояў у творах Шэкспіра, але, нягледзячы на тое, песімістычнасць не ёсць тыповай адзнакай ягонай творчасці. Сапраўды, на сённяшні дзень існуе вельмі моцная прывязка твораў В.Быкава да сучасных сацыяльных, грамадска-палітычных, часам, гістарычных рэалій. Такім чынам, узнікае адчуванне непазбежнасці надыходу нейкай драматычнай мяжы, за якой – небыццё.

Да таго ж, паказаць беларусам рэальную пагрозу іхняму існаванню, якая вынікае з канкрэтных, прычым неўсвядомленых учынкаў нацыі, не ёсць прычынай для таго, каб абвяшчаць В.Быкава невыправімым песімістам. Гэтым самым пісьменнік дае беларусам яшчэ адзін шанец – шанец адступіць крок назад, каб не апынуцца ў прорве небыцця, выйсця з якой ужо не будзе.

Арыгінальную інтэрпрытацыю творчай канцэпцыі В.Быкава дае Сакрат Яновіч. Як вядома, у цэнтры быкаўскай прозы стаіць чалавек, даследваць тонкія, няўлоўныя перажыванні якога і мае на мэце беларускі пісьменнік. Версія вядомага празаіка мае наступную рацыю: чалавек, якога знячэўку выштурхнулі ў хаос гісторыі часу, збіты з панталыку. Ягонае сутыкненне са злом непазбежнае. Як вядома, у выніку такой барацьбы індывід найчасцей трапляе ў катэгорыю пераможаных. У выніку гэтай гіпотэзы нараджаецца даволі простая выснова: так званы быкаўскі песімізм ёсць проста адлюстраваннем аб'ектыўнай праўды, ад якой, як не хочаш, ні куды не ўцячэш. Ды і спробы такіх уцёкаў на-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

родзяць абавязковае пакаранне ў выглядзе няспраўджаных надзей да канчатковага краху ілюзій.

У сучасным літаратуразнаўстве ўжо неаспрэчным стала палажэнне пра існаванне экзістэнцыяльных кірункаў творчасці В.Быкава. Сам жа экзістэнцыялізм найчасьцей абвінавачваюць менавіта ў песімізме. Аднак гэта супрацьрэчыць меркаванню Сартра, які пісаў:"Ці не за тое мы (людзі-А.А.) ім (экзістэнцыялізмам-А.А.) не задаволеныя, што ён, наадварот, надзвычай аптымістычны. Што насамрэч пужае іх у гэтай тэорыі? Ці не тое, што яна дае чалавеку магчымасць выбару?"[1]

Само пытанне выбару ў В. Быкава ўскладняецца тым, што ен, выбар, мусіць адбывацца ў памежнай сітуацыі, калі востра паўстае перспектыва небяспекі для самаго чалавечага існавання. Па сутнасці, герой выбірае паміж жыццем і смерцю, цверда ўсведамляючы, што аддаць перавагу першаму – значыць глыбока схаваць свае старыя ўяўленні пра дабро і зло, і гэтым самым выклікаць да жыцця надзвычай востры «канфлікт-у – сабе». Такая сітуацыя выяўляецца, прыкладам, у апавяданні «Бедныя людзі». Адметна і тое, што любы выбар будзе не на карысць героя. Такім чынам, драматызм сітуацыі ўзмацняецца яшчэ больш. Аднак асэнсаванне пярэдадня выбару менавіта ў такім кантэксце дазваляе зразумець сутнасць псіхалогіі чалавечых паводзін, знайсці вытокі тых ці іншых ягоных учынкаў. Гэта дазваляе сцвердзіць думку пра «самакаштоўнасць чалавечага жыцця»[2], што выяўляе глыбокую гуманістычную аснову творчасці пісьменніка.

Філасофскім ядром творчасці В.Быкава выступае асэнсаванне праблемы дабра і зла. Натуральна, што зло атрымоўвае ў светапоглядная сістэме пісменніка колькасную перевагу. Аднак паняцце колькасці ў дадзеным выпадку не есць тым, што вызначае песімістычнасць бачання. Задача пісменніка – у іншым – асудзіць ліха, якое мае канкрэтнае аблічча ў выглядзе грамадска-палітычнай сістэмы камунізму ці фашызму. Менавіта гэта і дае падставу не адчуць роспачы, ня гледзячы на тое, што героі трагічна гінуць, бо ўрэшце рэшт перавага маральная асацыюецца з увасабленнем светлага пачатку. Яно часта не мае канкрэтнага тэкставага выяўлення. Аднак яго існаванне відавочнае як аб'ектыўнае адлюстраванне процілеглай часткі сістэмы.

Што датычыць твораў В. Быкава ваеннай тэматыкі і найперш аповесці «Пакахай мяне, салдацік», то яны сапраўды пазбаўлены радасці перамог ды бравадных воклічаў пра тое, што мы, савецкі народ, выратавалі свет. І дзякуй Богу. Думаецца, беларуская літаратура досыць багатая на адлюстраванне трагедыі фарбамі таннага аптымізму, калі па-за ўвагай заставалася вывучэнне асобы на вайне.

У заключэнне можна адзначыць, што ў адносінах да творчасці В.Быкава мы маем справу са своеасаблівым мастакоўскім бачаннем свету, якое нельга вызначаць кантрасным падзелам на песімістычны і аптымістычны. Гэта, хутчэй за ўсе, адмысловае разуменне свету, якое балансуе паміж імкненнем да волі, незалежнасці і аб'ектыўнай немагчымасцю гэтага, якое ўзрасло на глебе жыццева-сацыяльнай ды гістарычнай неспрыяльнасці: «Усе жыцце я імкнуўся да свабоды – у тым ліку і да свабоды асабістай, свабоды распарадзіцца ўласным



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

лесам, чаго, зрэшты, мне ніколі не ўдавалася. Ды і ці магло ўдацца? Ці можна ажыццявіць якое з элементарных чалавечых памкненняў у несвабодным і бяспраўным грамадстве?»[3].

Літаратура:

1. Сартр Ж. П. Экзистенциолизм – это гуманизм /Сумерки богов. Мн., 1989. С. 321.
2. Васюченка П. Экзістэнцыялізм у беларускай рэдакцыі //Крыніца. 1996. № 3. С. 4.
3. З Васілем Быкавым гутарыць Юрась Залоска //Крыніца.1996.№ 3.С.11.